**Віталь Гарматны**
(Баранавічы)

# Кастусь Каліноўскі і паўстанне 1863-1864 гг.

## Уводзіны

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай польскае і беларуска-літоўскае грамадства знаходзілася некаторы час у стане глыбокага шоку, але сапраўдныя патрыёты не змірыліся са стратаю незалежнасці і вялі ўзброеную барацьбу за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Царскі ўрад жорстка расправаўляўся з прадстаўнікамі нацыянальна-вызваленчага руху, праводзіў тут рэпрэсіі, але гэта не спыняла патрыётаў.

Самым першым крокам па адраджэнню „дзяржавы абодвух народаў" можна лічыць паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, затым — паўстанне 1830-1831 гг., і, нарэшце, паўстанне 1863-1864 гг. пад кіраўніцтвам славутага сына беларускай зямлі, палымянага рэвалюцыянера Кастуся Каліноўскага. На вялікі жаль сучасная афіцыйная беларуская гістарыяграфія лічыць Каліноўскага польскім рэвалюцыянерам і прыніжае яго месца ў гісторыі Беларусі, аднак трэба адзначыць, што нават у савецкай гістарыяграфіі і літаратуры да Каліноўскага было больш паважлівае стаўленне — у яго гонар пісаліся вершы, апавяданні, п'есы (самы вядомы твор — несумненна бессмяротныя „Каласы пад сярпом тваім" Уладзіміра Караткевіча)[1].

Падчас паўстання 1863-1864 гг. у адных шэрагах змагаліся лепшыя сыны беларускага, украінскага, літоўскага, польскага народаў, акрамя таго многія рускія салдаты і афіцэры пераходзілі на бок паўстанцаў. За барацьбой нешматлікіх, але смелых паўстанцаў з войскамі аграмаднай Расійскай Імперыі сачылі ўсе перадавыя людзі таго часу. На тэму паўстання 1863-1864 гг. напісана шмат прац і навуковых артыкулаў, але многія высновы і меркаванні ўсё роўна патрабуюць далейшай распрацоўкі і вывучэння.

## 1. Падрыхтоўка новага паўстання

У канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя ў складзе актыўных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Расій-

[1] А. А. Дубавік, *Асоба і дзейнасць К. Каліноўскага ў беларускай крытыцы (канец XX — пачатак XXI стст.)*, „Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук", 2006, № 4, с. 99-104; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, Минск 1963, с. 7-9.

скай Імперыі адбываюцца якасныя змены: дваранскія рэвалюцыянеры саступаюць месца выхадцам з дэмакратычных пластоў насельніцтва („разначынцы”), якія сталі выразнікамі інтарэсаў шырокіх працоўных мас, прадстаўленых у той час найперш за ўсё сялянствам. Створаная разначынцамі патаемная арганізацыя „Зямля і воля” (1861-1864 гг.) займалася падрыхтоўкай усерасійскага сялянскага паўстання з мэтай устанаўлення народаўладдзя, перадачы ўсёй зямлі сялянам без выкупу, пабудовы сацыялістычнага ладу на аснове рэфармаванай сялянскай абшчыны, утварэння добраахвотнай федэрацыі абласцей. Надзеі на ажыццяўленне гэтай праграмы асабліва ўзмацніліся пасля ўздыму антыпрыгонніцкага сялянскага руху і ўзнікнення рэвалюцыйнай сітуацыі напярэдадні і падчас правядзення аграрнай рэформы 1861 г.

Пасля даволі жорсткай антыпольскай палітыкі Мікалая I, выкліканай паўстаннем 1830-1831 гг., расійскі імператар Аляксандр II падчас „Севастопальскай адлігі” пайшоў на некаторыя саступкі палякам: было адменена ваеннае становішча, частка сасланых паўстанцаў вярнулася з Сібіры, быў дадзены дазвол на заснаванне ў Варшаве „Земляробчага таварыства”, якое займалася вывучэннем сялянскага пытання, але ўсе прынятыя меры не толькі не паслабілі, а нават узмацнілі антырускія настроі польскага грамадства, бо палякі не змірыліся са стратаю незалежнасці.

У 1858 г. у Вільні пры падтрымцы генерал-губернатара Уладзіміра Іванавіча Назімава адкрыты Музей старажытнасцей, які адразу ж стаў цэнтрам і духоўным асяродкам прапаганды ваяўнічага паланафільства. Пачала адкрыта прапагандавацца барацьба супраць рускага ўрада, распаўсюджвацца рэвалюцыйная літаратура. У 1861 г. у Варшаве, іншых гарадах Польшчы, а таксама ў Літве і заходніх губернях Беларусі і Украіны пракацілася хваля польскіх патрыятычных дэманстрацый[2].

Патрыятычны лагер падзяляўся на дэмакратаў, якія выступалі за паўстанне, і лібералаў, прыхільнікаў мірных сродкаў барацьбы. Тыя, хто быў за паўстанне, атрымалі назву „чырвоныя”. Фактычна яны ўяўлялі сабою шырокі і разнастайны дэмакратычны блок, у які ўваходзілі: рэвалюцыянізаваная дробная і беззямельная шляхта, афіцэры, дробная гарадская буржуазія, гарадскія нізы, інтэлігенцыя, студэнцтва і часткова сялянства[3]. Барацьбу за незалежнасць яны звязвалі ў першую чаргу з вырашэннем аграрнага пытання, самыя радыкальныя з іх знаходзіліся ў гэтым плане пад уплывам ідэй Герцэна, Дабралюбава, Чарнышэўскага. Так, з 1858 г. у Пецярбургу існаваў гурток палякаў — слу-

[2] М. В. Доўнар-Запольскі, *Гісторыя Беларусі*, Мінск 1994, с. 274-275; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 42.

[3] У. М. Ігнатоўскі, *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*, Мінск 1992, с. 170.

хачоў вайсковых акадэмій і афіцэраў, якімі кіравалі сябры Тараса Шаўчэнкі і Мікалая Чарнышэўскага — Зыгмунт Серакоўскі і Яраслаў Дамброўскі: яны былі прыхільнікамі саюзу паміж рэвалюцыянерамі Польшчы, Літвы, Беларусі і Расіі, спалучэнне нацыянальнага паўстання звязвалі з сацыяльным пераваротам, а вырашэнне аграрнага пытання меркавалі ажыццявіць на карысць сялян. Прадугледжваліся ўраўнаванне грамадзянскіх правоў сялян і шляхты, замена падушнага падатку падымным і замест 15-гадовай рэкрутчыны — трохгадовая вайсковая служба ў сваім краі, а таксама аднаўленне уніяцкай царквы.

Праціўнікаў паўстання называлі „белымі" — гэта былі пераважна памешчыкі з „Земляробчага таварыства", сярэдняя буржуазія, частка інтэлігенцыі. Яны не жадалі ніякіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. „Белыя" жадалі аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., гэта значыць з уключэннем у яе склад Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны, арыентуючыся на заходнееўрапейскія дзяржавы.

Сярод „чырвоных" не было адзінства: па шляху вырашэння аграрнага пытання яны дзяліліся на „правых" — памяркоўных і „левых" — радыкалаў. „Правыя" ў вырашэнні сваёй палітычнай праграмы адводзілі вядучую ролю шляхце. Асцерагаючыся сялянскага паўстання, яны выступалі за надзяленне сялян зямлёю за кошт канфіскацыі яе часткі ў памешчыкаў з адпаведнай ім грашовай кампенсацыяй[4].

„Левыя" прызнавалі права літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў на нацыянальнае самавызначэнне і залог поспеху нацыянальна-вызваленчай барацьбы бачылі перш за ўсё ў дасягненні цеснага саюзу з рэвалюцыйнымі сіламі Расійскай Імперыі. Для кіраўніцтва паўстаннем „чырвонымі" вясною 1862 г. у Варшаве створаны Цэнтральны Нацыянальны Камітэт (ЦНК)[5].

Падобныя палітычныя плыні існавалі яшчэ раней на Беларусі, Літве і на Украіне. Так, у Вільні летам 1862 г. з мэтай падрыхтоўкі паўстання быў створаны Літоўскі Правінцыйны Камітэт (ЛПК), які падначальваўся ЦНК. У ЛПК уваходзілі прадстаўнікі як „чырвоных", так і „белых". Сярод іх былі Людвіг Звяждоўскі, Якуб Козел, Баляслаў Длускі, Зыгмунт Чаховіч, Эдмунд Вярыга і К. Каліноўскі[6]. Па ініцыятыве ЛПК

[4] А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 60-63.

[5] С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 23; Г. Кісялёў, *Каліноўскі — знаёмы і незнаёмы*, „Полымя", 1993, № 6, с. 221; І. Трызна, *Канстанцін Каліноўскі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 17.

[6] *Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён*, т. 2: *Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.*, пад рэд. В. П. Панюціча, Мінск 2002, с. 72-74; М. В. Доўнар-Запольскі, *Гісторыя Беларусі*, с. 279.

збіраліся сродкі на паўстанне і ствараліся мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі: гродзенская (кіраўнік К. Каліноўскі), мінская (Антон Трусаў), навагрудская (Уладзіслаў Борзабагаты) і іншыя[7].

На перамовах прадстаўнікоў ЦНК з выдаўцамі часопіса „Колокол" (Аляксандр Герцэн, Мікалай Агароў, Міхаіл Бакунін) у Лондане ў верасні 1862 г. апошнія прапанавалі польскім рэвалюцыянерам прыняць больш радыкальныя лозунгі расійскай рэвалюцыйнай дэмакратыі: „Зямля — сялянам, воля — правінцыям", гэта адносілася перш за ўсё да Літвы, Беларусі і Украіны. У пісьме А. Герцэна „Русским офицерам в Польше" (кастрычнік 1862 г.) падкрэслівалася: „Зямля — сялянам, самастойнасць абласцям — на гэтай падставе, і толькі на ёй можа ўстанавіцца дзейсны саюз ваш з польскімі братамі... Скажам разам з палякамі, быць Літве, Беларусі і Украіне з кім яны быць хочуць, ці ні з кім, толькі б волю іх уведаць — не падробленую, а сапраўдную".

Аднак фактычна гэтыя ідэі былі не ўспрыняты „белымі", якія займалі пануючае месца ў польскім вызваленчым руху.

## 2. Кастусь Каліноўскі і яго месца ў гісторыі Беларусі

Кастусь Каліноўскі (Вікенцій Канстанцін Сямёнавіч; псеўданімы Яська гаспадар з-пад Вільні, Хам, Хамуціус, Хамовіч, Ігнат Вітажэнец і іншыя; 2.2.1838 г. — 22.3.1864 г.) нарадзіўся ў вёсцы Мастаўляны Гродзенскага павета (зараз Беластоцкае ваяводства Польшчы) у сям'і беззямельнага шляхціца, уладальніка невялікай ткацкай мануфактуры[8]. Потым разам з другой жонкай, Ізабэлай Лазарэвіч, бацька, Сямён Сцяпанавіч, разумны і энергічны прадпрымальнік, набыў невялікі фальварак Якушоўка (220 дзесяцін зямлі) паблізу мястэчка Свіслач Ваўкавыскага павета. Туды пераехалі Каліноўскія і была пераведзена мануфактура. У 1855 г. бацька дамогся зацвярджэння сенатам Каліноўскіх у дваранскім званні, але матэрыяльнае становішча сям'і, у якой ад двух шлюбаў было 17 дзяцей, заставалася цяжкім[9].

У 1847 г. Кастусь Каліноўскі (такое імя будучага павадыра паўстання на Беларусі і Літве замацавалася як пры яго жыцці, так і ў сучаснай

[7] С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі*, Магілёў 1999, с. 111.

[8] *Асветнікі зямлі беларускай (X — пач. XX стст.). Энцыклапедычны даведнік*, Мінск 2001, с. 449; І. Трызна, *Канстанцін Каліноўскі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 13; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 12; В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, Мінск 2002, с. 214.

[9] К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць. Творы, дакументы*, уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва, Мінск 1999, с. 7.

гістарыяграфіі)[10] паступіў у першы клас Свіслацкай гімназіі, славутай не толькі высокім узроўнем надаваемай адукацыі, але і багатымі традыцыямі ўдзелу навучэнцаў у нацыянальна-вызваленчым руху[11]. Вялікі ўплыў на станаўленне К. Каліноўскага як рэвалюцыянера аказаў яго старэйшы брат Віктар. Пасля заканчэння гімназіі (каля 1852 г.), К. Каліноўскі тры гады жыў дома ў Якушоўцы, дапамагаў бацьку па гаспадарцы і займаўся самаадукацыяй, але старэйшы брат, Віктар, студэнт Маскоўскага ўніверсітэта, паклікаў да сябе.

У канцы 1855 г., напярэдадні свайго паўнагоддзя Кастусь паехаў у Маскву да брата з намерам паступіць ва ўніверсітэт, але хутка ў братоў змяніліся планы і яны пераехалі ў Пецярбург[12], дзе К. Каліноўскі стаў студэнтам першага курса юрыдычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта па разрадзе камерцыйных навук[13], які рыхтаваў да гаспадарчай або адміністрацыйнай кар'еры і даваў добрую агульную адукацыю. Апрача спецыяльных юрыдычных курсаў К. Каліноўскі вывучаў рускую і ўсеагульную гісторыю, псіхалогію, сельскую гаспадарку, французскую мову і іншыя навукі.

Студэнцкія гады мелі вырашальнае значэнне для станаўленя рэвалюцыйнага светапогляду К. Каліноўскага: юнак уважліва сачыў за публікацыямі ў „Современнике" і „Колоколе", чытаў творы рэвалюцыянераў-дэмакратаў, а, магчыма, сам быў асабіста знаёмы з павадырамі рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў Мікалаем Чарнышэўскім, Мікалаем Дабралюбавым і Тарасам Шаўчэнкам, якія ў гэтыя гады жылі ў Пецярбургу[14]. У тыя бурныя студэнцкія часы К. Каліноўскі неаднаразова абіраўся бібліятэкарам-кіраўніком арганізацыі студэнтаў „Огул" — выхадцаў з Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны і ўзначальваў у „Огуле" найбольш радыкальнае крыло. З утварэннем у Пецярбургу каля 1858 г. вайскова-рэвалюцыйнай арганізацыі Серакоўскага-Дамброўскага браты Каліноўскія сталі актыўнымі яе дзеячамі.

[10] Г. Кісялёў, *Каліноўскі — знаёмы і незнаёмы*, „Полымя", 1993, № 6, с. 218-219; В. Шалькевіч, *Каліноўскі: Канстанцін, Кастусь ці Вікенцій?*, „Беларуская мінуўшчына", 1994, № 4, с. 43-44.

[11] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, Минск 1988, с. 53.

[12] С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 110.

[13] В. Шалькевіч, *Каліноўскі: Канстанцін, Кастусь ці Вікенцій?*, „Беларуская мінуўшчына", 1994, № 4, с. 43-44.

[14] С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 21; К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць...*, с. 8; С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі...*, с. 110; В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 214.

Жылі браты ў Пецярбургу на заробкі Віктара, які перапісваў гістарычныя дакументы, і на невялікую стыпендыю Кастуся, якую ён стаў атрымліваць з 1858 г., акрамя таго малодшы брат займаўся рэпетытарствам, але ўсё роўна вымушаны быў час ад часу звяртацца за грашовай дапамогай у рэктарат універсітэта[15]. Вядома таксама, што ў гэты перыяд К. Каліноўскі цяжка хварэў, але тым не менш ён выдатна вучыўся і летам 1860 г. паспяхова скончыў універсітэцкі курс, а пасля падачы дысертацыі ў студзені 1861 г. зацверджаны папячыцелем Пецярбургскай навучальнай акругі ў ступені кандыдата права[16].

К. Каліноўскі вярнуўся дадому, дзе зрабіў няўдалую спробу ўладкавацца на службу ва ўправу мясцовага генерал-губернатара. Выпускніку аднаго з самых прэстыжных універсітэтаў Расійскай Імперыі было адмоўлена па прычыне адсутнасці вакансій[17]. Вяртанне Каліноўскага на радзіму супала з моцным уздымам рэвалюцыйнага руху, выкліканага правядзеннем аграрнай рэформы 1861 г. — Кастусь Каліноўскі стаў адным з павадыроў гэтага руху, лідарам яго дэмакратычнай плыні („чырвоных"). На працягу 1861 г. ён стварыў на Гродзеншчыне з ліку разначыннай інтэлігенцыі нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю, звязаную з такімі ж арганізацыямі ў Вільні. Каліноўскі і яго паплечнікі вялі сярод мясцовых сялян агітацыю і заклікалі да змагання з памешчыкамі і самаўладдзем[18].

Летам 1862 г. К. Каліноўскі стаў членам, а ў кастрычніку таго ж года — старшынёю Літоўскага Правінцыйнага Камітэта (ЛПК) у Вільні, своеасаблівага цэнтра па падрыхтоўцы ўсеагульнага ўзброенага паўстання на тэрыторыі Літвы і Беларусі[19]. У склад ЛПК увайшлі таксама капітан Генеральнага штаба Людвіг Звяждоўскі, юрыст Эдмунд Вярыга, урач Баляслаў Длускі, памешчык Зыгмунт Чаховіч, інжынерны афіцэр Якаў Казела[20].

[15] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 112.

[16] *Асветнікі зямлі беларускай (X — пач. XX стст.)*, с. 450; І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, Мінск 2004, с. 163.

[17] К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 85; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 46-47; *Сыны і пасынкі Беларусі*, уклад. С. В. Барыс, Мінск 1996, с. 168. Цікава, як бы далей склаўся лёс Каліноўскага, калі б яму ўдалося ўладкавацца на працу ў губернскую канцылярыю?

[18] В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 215.

[19] С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі.*, с. 111.

[20] С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 21; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 48; І. Трызна, *Канстанцін Каліноўскі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 15.

Разам з Валерыем Урублеўскім, Феліксам Ражанскім і іншымі сваімі сябрамі Кастусь Каліноўскі летам 1862 г. пачаў выданне першай у гісторыі Беларусі нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты „Мужыцкая праўда”: на працягу 1862-1863 гг. выдадзена сем нумароў газеты[21], аўтарам і рэдактарам большасці з матэрыялаў газеты быў сам К. Каліноўскі, які пісаў часцей за ўсё пад псеўданімам „Яська гаспадар з-пад Вільні”[22].

„Мужыцкая праўда” выдавалася ў форме адозваў і ўпершыню на беларускай — „мужыцкай” — мове лацінскім шрыфтам. Яна несла ў асяроддзе сялянства рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі, рыхтавала іх да паўстання. Каліноўскі таксама асабіста ўдзельнічаў у распаўсюджанні газеты — аднойчы яго ледзьве не затрымалі царскія жандары, калі той раскідваў экземпляры газеты з фурманкі на шляху са Слоніма ў Ваўкавыск[23]. Дакладнае месца выдання газеты невядома, хутчэй за ўсё яе друкавалі ў некалькіх месцах і адным з такіх месцаў дакладна было Гродна.

Звяртаючыся да беларускіх сялян, „Мужыцкая праўда” ў першым нумары заявіла: „Возьмемся, дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам! А калі паны хочуць трымаць разам з намі, то няхай жа робяць па святой справядлівасці: бо калі іначай — то хай іх чорт пабяры! Мужык, пакуль здужае трымаць касу і сякеру, бараніць свайго патрапіць і ў нікога ласкі прасіць не будзе”[24].

**Ніхто не дасць вольнасці мужыкам, мужыкі павінны самі заваяваць яе і пабудаваць новы парадак — такі і так, як захочуць самі,** — такі быў лейтматыў „Мужыцкай праўды”. „А для таго, дзецюкі, каб ніхто вас не мог ашукаць, цяпер ужо талкуйце паміж сабою, якой вам вольнасці патрэбна і якім адно спосабам мужык яе дастаць можа”, — пісаў Каліноўскі: адсюль можна зрабіць вывад, што ён адназначна зыходзіў з ідэі народнай, сялянскай рэвалюцыі і ўсталявання ў яе выніку народаўладдзя і прынцыпова разыходзіўся не толькі з „белымі”, але і з памяркоўнымі „чырвонымі”, якія рабілі стаўку на вядучую ролю шляхты.

У адносінах да рэлігіі Каліноўскі лічыў сапраўды народнай і беларускай рэлігіяй уніяцтва, але сам да канца жыцця заставаўся каталі-

[21] І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, с. 163.

[22] *Асветнікі зямлі беларускай (Х — пач. ХХ стст.)*, с. 450; К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 10; В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 215.

[23] А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 59; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 162.

[24] К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 28.

ком[25]. Намёкі на несправядлівасць скасавання ўніі і заклікі да яе аднаўлення ўтрымліваюцца ў скіраванай да беларускіх сялян „Гутарцы двух суседаў”, „Пісьме ад Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай” (мяркуемы аўтар К. Каліноўскі), паўстанцкім маніфесце Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы ад 3 мая 1863 г. На думку павадыра паўстанцаў унія збліжала беларускіх сялян са спадчынай былой Рэчы Паспалітай у шырокім яе значэнні, таму ён спрабаваў выкарыстаць незадавальненне сялян адменаю ўніі дзеля таго, каб узняць іх на барацьбу з царызмам[26].

Каліноўскі бліскуча і вельмі лаканічна, але ў той жа час вельмі проста і зразумела для непісьменнага селяніна, сфармуляваў ідэю дэмакратычнай, народнай, прававой дзяржавы: „І як добры слуга глядзіць худобы гаспадарскай і слухае свайго гаспадара, так добры ўрад глядзець павінен шчасце людзей, слухаць народу і рабіць так, як народаві лепей. І не дзіва, бо **не народ зроблены для ўрада, а ўрад для народа**”[27].

Разам з тым прамых заклікаў да захопу памешчыцкіх зямель у „Мужыцкай праўдзе” не было, не ўзнімала газета і нацыянальнае пытанне. У больш поўнай меры свае рэвалюцыйна-дэмакратычныя погляды Кастусь Каліноўскі адстойваў і прапагандаваў на пасяджэннях Літоўскага Правінцыйнага Камітэта, дзе цвёрда і паслядоўна дабіваўся ўстанаўлення раўнапраўных адносін паміж ЛПК і ЦНК, прыняцця радыкальнай праграмы па аграрна-сялянскім пытанні, прызнання права Літвы, Украіны і Беларусі на стварэнне самастойнай дзяржавы. Поспех паўстання ў вырашальнай ступені Каліноўскі звязваў з сялянствам, са

[25] *Дастаеўскі і Каліноўскі (Спроба рэлігійна-маральнага супастаўлення лёсаў)*, Жыровічы 2008, с. 13.

[26] М. Б. Батвіннік, *Г. В. Кісялёў — даследчык жыцця, дзейнасці і светапогляду К. Каліноўскага*, „Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук”, 1995, № 3, с. 81; Я. У. Усошын, *Кастусь Каліноўскі і царкоўная унія*, [у:] *Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки*, вып. 6 (11), ч. 1, Минск 2008, с. 290, 296; Я. У. Усошын, *Пытанне царкоўнай уніі ў агітацыйных матэрыялах паўстанцаў 1863 г.*, [у:] *Религия и общество — 3: актуальные проблемы современного религиоведения*, Могилёв 2008, с. 127.

[27] М. Б. Батвіннік, *Г. В. Кісялёў — даследчык жыцця, дзейнасці і светапогляду К. Каліноўскага*, „Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук”, 1995, № 3, с. 79; *История Беларуси в документах и материалах*, авторы-составители И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец, Минск 2000, с. 201-209; К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 32; С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 112; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 154-155.

стварэннем сялянскай арганізацыі і ў сувязі з гэтым выступаў за перадачу ўсёй зямлі сялянам, а шляхту К. Каліноўскі лічыў „гнілой і разбэшчанай кастай” — „Каб яна [шляхта] і згінула, краіна ад гэтага ніколькі б не пакутавала”[28].

Як пісаў пра Каліноўскага Якуб Гейштар, лідар літоўска-беларускіх „белых”: „Гэта была натура гарачлівая, але сумленная, без малейшай крывадушнасці. Адданы душой і сэрцам люду і Бацькаўшчыне, але прасякнуты крайнімі тэорыямі, прытым літоўскі сепаратыст і на словах крыважэрны дэмагог. Быў ён непараўнальным, узорным канспіратарам, душою Камітэта”.

К. Каліноўскаму і яго аднадумцам — беларускім і літоўскім рэвалюцыянерам так і не ўдалося паўплываць на пазіцыі ЦНК, які цалкам праігнараваў патрабаванні беларуска-літоўскіх рэвалюцыйных дэмакратаў і нават рашэнне аб пачатку паўстання варшаўскія дзеячы прынялі, не ўзгадніўшы з Вільняй, не ўважыўшы, як пісаў Кастусь Каліноўскі, „інтарэсаў Літвы”[29].

Развіваючы лепшыя традыцыі рускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў, Кастусь Каліноўскі глыбока раскрыў сутнасць прыгонніцкай эксплуатацыі ва ўсіх яе формах, паказаў паразітызм памешчыкаў, выключна цяжкае тагачаснае становішча сялян Беларусі. У публіцыстыцы К. Каліноўскага яскрава адлюстравана цяжкае становішча казённых (дзяржаўных) сялян, якіх бязлітасна эксплуатавалі і прадстаўнікі царскай адміністрацыі, і арандатары маёнткаў[30].

Каліноўскі рэзка крытыкаваў дзяржаўную машыну абсалютызму, дзе велізарны бюракратычны апарат кіраўніцтва бессправаздачны і непадкантрольны, у выніку чаго ў ім квітнее шырокая ганебная сістэма карупцыі і рознага роду злоўжыванняў: хабарніцтва і ліхвярства. Ён трапна параўноўваў царскіх чыноўнікаў з саранчою, якае знішчае на сваім шляху ўсю расліннасць, пераўтварае аазісы ў пустыню[31].

Кастусь Каліноўскі настойліва рассейваў царысцкія ілюзіі сялян, пераканаўча даказваў, што ўсе беды народа зыходзяць менавіта ад самога

[28] І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, с. 163; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 137; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 159, 212.

[29] *Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён*, т. 2: *Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.*, с. 76.

[30] І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, с. 163.

[31] *Асветнікі зямлі беларускай (X — пач. XX стст.)*, с. 452; С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 113; В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 217; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 154.

цара. К. Каліноўскі належаў да ліку тых мысліцеляў, што выступалі таксама з рэзкай і непрымірымай крытыкай капіталізму, у якім ён бачыў толькі новую сістэму эксплуатацыі чалавека чалавекам, гэта быў пераканаўчы і паслядоўны праціўнік эксплуататарскага ладу, прыхільнік карэннай перабудовы грамадства на новых, справядлівых пачатках[32].

Каліноўскі марыў раздаць усю зямлю сялянам, бо яна „ад дзядоў і прадзедаў" была іх уласнасцю[33]. Рэвалюцыянер заставаўся на працягу ўсяго жыцця шчырым і гарачым прыхільнікам ідэалаў сялянскага абшчыннага сацыялізму, выдатнымі прадстаўнікамі якога былі расійскія рэвалюцыянеры-дэмакраты; выступаў за рашучую адмену ўсіх класавых, нацыянальных і рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў з тым, каб галоўным крытэрыем каштоўнасці чалавечай асобы зрабіць працу: ацэньваць чалавека не па яго паходжанні, а па яго рэальных справах і заслугах[34]. Гэтаю мерай К. Каліноўскі марыў выкараніць з грамадства марнатраўства і паразітызм прывеліяваных класаў і найперш за ўсё шляхты, таму яго можна назваць беларускім сацыял-утапістам. Каліноўскі не прапускаў выпадку, каб паказаць праз газету агульнасць становішча і мэтаў беларускіх сялян з „народам у Пецярбургу, Маскве і па цэлай Расеі", з „мужыкамі каля Варшавы"[35].

Арганічнай часткай сацыяльнай утопіі К. Каліноўскага сталі яго ідэі аб выхаванні: галоўнай умовай пашырэння асветы ён лічыў карэнную змену існуючых сацыяльна-палітычных адносін[36]. Пакуль народ не будзе свабодны, не будзе ні справядлівасці, ні багацця, ні навукі, таму рэвалюцыянер выказваўся за ўсеагульную адукацыю і выхаванне, якімі будзе займацца непасрэдна дзяржава, за тое, каб школа фармавала ў дзяцей высокія грамадскія якасці і гуманістычныя ідэалы, лічыў за неабходнае развіваць асвету і навуку на роднай беларускай мове[37]. Вялікую ролю ў жыцці грамадства адводзіў жанчыне, а вырашэнне жаночага пытання бачыў у карэнным пераўтварэнні грамадства[38].

32 М. Б. Батвіннік, *Г. В. Кісялёў — даследчык жыцця, дзейнасці і светапогляду К. Каліноўскага*, „Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук", 1995, № 3, с. 84- 85; С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 114; І. Трызна, *Канстанцін Каліноўскі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 17.

33 І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, с. 165; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 55.

34 *Асветнікі зямлі беларускай (X — пач. XX стст.)*, с. 453.

35 К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 13.

36 В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 219.

37 С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 114.

38 В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 220; В. Ф. Шальке-

Значнае месца ў будучым грамадстве Каліноўскі адводзіў дэмакратычным формам праўлення. Разумеючы прызначэнне дзяржавы ў тагачасным прыгонніцкім грамадстве, ён звязваў вызваленне сялянства і ўсіх працоўных з пераходам дзяржаўнай улады ў рукі народа. Найлепшай формай дзяржаўнай будовы лічыў рэспубліку. Ажыццяўленне ўсіх сваіх сацыяльных праектаў і планаў Каліноўскі як прыхільнік рэвалюцыйна-дэмакратычных ідэй Чарнышэўскага і Герцэна звязваў з сялянскай рэвалюцыяй[39].

Каліноўскі быў перакананы, што толькі народная рэвалюцыя можа прынесці сялянам жаданую зямлю і свабоду[40], падкрэсліваў, што свабоду можна заваяваць толькі шляхам узброенай барацьбы. Але ён у поўнай меры асэнсоўваў увесь цяжар гэтай нялёгкай задачы, якая стаяла перад народам, лічыў яе цалкам дасягальнай, бязмежна верыў у сілы народа. Бачыў галоўную рэвалюцыйную сілу ў сялянстве разам з гараджанамі і студэнтамі, падкрэсліваў, што ў іх з сялянамі агульныя інтарэсы[41]. Паколькі рыхтуемае паўстанне на Беларусі і Літве насіла нацыянальна-вызваленчы характар, Кастусь Каліноўскі не выключаў магчымасці ўдзелу ў ім асобных памешчыкаў, але на такой ідэйнай платформе, каб гэта не супярэчыла інтарэсам сялян. К. Каліноўскі быў перакананы, што сапраўднай свабоды і народнага шчасця можна дасягнуць толькі поплеч з народам Расіі, актыўна змагаючыся разам з ім супраць агульных прыгнятальнікаў[42]. Наспелае паўстанне на Беларусі і ў Літве Каліноўскі разглядаў як частку агульнарасійскай сялянскай рэвалюцыі, якую рыхтавалі рускія рэвалюцыянеры-дэмакраты.

Разам з тым К. Каліноўскі вядомы не толькі як рэвалюцыянер-інтэрнацыяналіст, палымяны прыхільнік ідэі саюзу ўсіх народаў у барацьбе з самадзяржаўем, але і як выдатны знаўца беларускай народнай мовы. Шырока і з вялікім майстэрствам ён карыстаўся ёю ў сваёй публіцыстыцы, садзейнічаў яе літаратурнаму развіццю — пісаў вершы. Як родапачынальнік беларускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, К. Каліноўскі зрабіў вялікі ўплыў на ўсю наступную беларускую літаратуру і культуру, садзейнічаў, паглыбленню ў літаратуры і мастацтве прынцыпаў рэалізму і народнасці, замацаванню высокіх ідэалаў барацьбы за свабоду. Ідэйныя прынцыпы Каліноўскага развівалі паслядоўна ў сваёй творчасці Францішак Багушэвіч, Янка Купала, Якуб Колас, Цётка і іншыя выдатныя беларускія літаратары[43]. Як успамінала Элаіза Ажэшка, пісь-

вич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 214.

[39] *Асветнікі зямлі беларускай (X — пач. XX стст.)*, с. 453.

[40] С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 113-114.

[41] І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*, с. 164-165.

[42] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 165-166;

[43] В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 221.

менніцай яе зрабіў 1863 год[44]. Гэтыя яе словы маглі б паўтарыць многія тагачасныя славутыя беларускія пісьменнікі...

### 3. Студзеньскае паўстанне

Падрыхтоўка да паўстання яшчэ не была завершана, калі ў канцы 1862 г. стала вядома аб намеры расійскага ўрада правесці ў Польшчы масавы рэкруцкі набор. Набору падлягалі якраз тыя групы насельніцтва, з якіх вербаваліся члены будучых паўстанцкіх атрадаў. Гэта прымусіла ЦНК, вайсковым кіраўніком якога пасля арышту Яраслава Дамброўскага стаў Зыгмунт Падлеўскі, прызначыць паўстанне на студзень 1863 г.

10 (22) студзеня 1863 г. ЦНК абвясціў сябе Часовым нацыянальным урадам і заклікаў паўстанцкія атрады да нападу на рускія войскі ў правінцыйных гарнізонах. У маніфесце і двух аграрных дэкрэтах Часовага нацыянальнага ўрада выкладзена праграма паўстання[45]: Польшча абвяшчалася незалежнай краінай з роўнымі правамі ўсіх яе грамадзян перад законам; дазвалялася ўніяцкае веравызнанне, планавалася перадаць сялянам іх зямельныя надзелы ў поўнае ўладанне, а памешчыкам выплаціць кампенсацыю з дзяржаўнай казны; пасля перамогі было паабяцана надзяліць зямлёю беззямельных сялян-удзельнікаў паўстання. Спецыяльны зварот да насельніцтва Беларусі і Літвы заклікаў падтрымаць паўстанне ў Польшчы, але ў ім нічога не гаварылася аб нацыянальна-палітычным самавызначэнні гэтых тэрыторый. ЛПК абвясціў сябе Часовым урадам на Літве і Беларусі, але ўзаемаразуменне паміж ЦНК і ЛПК так і не было дасягнута.

Па загадзе Сената ад 15 студзеня 1863 г. у памежных з Царствам Польскім губернях уводзілася ваеннае становішча. У выніку ўсе ўзятыя ў палон паўстанцы належалі вайсковаму суду на падставе вайскова-крымінальнага статута, які сцвярджаў: „усе жыхары ў губернях і абласцях, аб'яўленых на ваенным становішчы", якія здзейснілі якія-небудзь супрацьзаконныя дзеянні, належаць ваеннаму суду на падставе палявых крымінальных законаў[46].

У студзені-лютым 1863 г. на Беларусі з'явіліся першыя паўстанцкія

[44] Г. Кісялёў, *Францішак Багушэвіч і паўстанне 1863 г.*, „Роднае слова", 2001, № 3, с. 89.

[45] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 167.

[46] Е. В. Серак, *Система наказаний участников восстания 1863-1864 гг. в Беларуси: правовая регламентация*, [в:] *Актуальные проблемы современного гуманитарного образования. Материалы 3 республиканской научной конференции молодых учёных и аспирантов (Минск, РИВШ, 29 ноября 2006 г.)*, редкол.: В. И. Дынич и др, Минск 2006, с. 240.

атрады, якія прыйшлі з Польшчы: самы буйны з іх узначальваў Раман Рагінскі. Ён прайшоў праз Пружанскі павет да Пінскага, але там ля вёскі Боркі ў лютым 1863 г. быў разбіты рускімі войскамі.

20 студзеня (1 лютага) 1863 г. ЛПК, які ўзначальваў К. Каліноўскі, звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам падняцца на ўзброеную барацьбу з рускімі войскамі. ЛПК прыняў праграму, якую раней абвясціў ЦНК: паводле гэтай праграмы прадугледжвалася раўнапраўе незалежна ад саслоўяў, нацыянальнасці і веравызнання ўсіх грамадзян перад законам, у поўную ўласнасць сялян перадаваліся надзелы, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, адмяняліся іх феадальныя павіннасці; разам з тым захоўвалася памешчыцкае землеўладанне і выкуп зямлі сялянамі за грошы. Беззямельныя сяляне, удзельнікі паўстання, павінны былі атрымаць па 3 моргі (2,1 га) зямлі. Па сваім сацыяльна-эканамічным характары гэта была буржуазная праграма, якая адпавядала інтарэсам „чырвоных”[47].

Першыя паўстанцкія атрады ўзніклі ў Заходняй Беларусі ў канцы студзеня 1863 г., а ў сакавіку-красавіку 1863 г. паўстанне ахапіла ўсю Беларусь. Шэрагі паўстанцаў папаўняліся перш за ўсё за кошт дробнай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, гімназістаў старэйшых класаў, сялян. Атрады паўстанцаў, якія ўзначальваліся В. Урублеўскім, Ф. Ражанскім (Гродзенская губерня), Зыгмунтам Серакоўскім і Антанасам Мацкявічусам (Ковенская губ.)[48], А. Трусавым (Мінская губ.), Л. Звяждоўскім (Магілёўская губ.), Максімам Чэрняком (Віленская губ.) імкнуліся прыцягнуць да паўстання як мага больш сялян, спрабавалі рэалізаваць аграрную праграму[49].

Кіраўнікі паўстання, асабліва К. Каліноўскі, мелі намер распаўсюдзіць паўстанне на прыбалтыйскія і рускія губерні, дзеля гэтага прадугледжвалася стварэнне новых атрадаў: З. Серакоўскага ў Літве і Эстоніі, Отана Грабніцкага, Баляслава Кульчыцкага ў Віцебскай губерні[50]. На дапамогу Л. Звяждоўскаму з Санкт-Пецярбурга і Масквы прыбылі афіцэры Ігнат Будзіловіч, Канстанцін Жаброўскі і іншыя з мэтай распаўсюджвання паўстання на Смаленскую і нават на Маскоўскую губерні.

„Белыя” баяліся радыкалізацыі і пашырэння маштабаў паўстаня, таму ў лютым 1863 г. Нестар Дзюлёран, выключаны раней з ЛПК, дамо-

[47] К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 9; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 167.

[48] К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 119-120.

[49] Л. Падгайская, *Роля паўстанняў 1794, 1830-1831, 1863-1864 гг. у фарміраванні ўяўленняў пра беларуска-літоўскую шляхту*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2003, № 7, с. 8.

[50] М. В. Доўнар-Запольскі, *Гісторыя Беларусі*, с. 280.

віўся з лідарамі віленскіх „белых” Аляксандрам Аскеркам і Якубам Гейштарам аб захопе ўлады ў паўстанцкай арганізацыі Літвы-Беларусі і атрымаў згоду на гэта ад варшаўскага ўрада: 27 лютага (11 сакавіка) 1863 г. змоўшчыкі адхілілі ад улады Часовы ўрад Літвы і Беларусі і замянілі яго Аддзелам кіраўніцтва правінцыямі Літвы, які ўзначаліў Я. Гейштар, а Н. Дзюлёран зноў стаў камісарам ЦНК у Вільні. Ад імя аддзела быў распаўсюджаны спецыяльны дэкрэт, паводле якога абвяшчаліся несапраўднымі і адмяняліся „ўсе паўнамоцтвы і мандаты”, выдадзеныя ЛПК[51]. У сувязі з гэтымі падзеямі Аскар Авейдэ паказваў потым камісіі: „Правінцыйны камітэт (ЛПК) не хацеў нейкі час саступаць, але па загадзе Цэнтральнага камітэта здаў і сваю арганізацыю (свае падпольныя структуры на тэрыторыі Беларусі і Літвы) і самога сябе новаўстаноўленай у Вільні рэвалюцыйнай уладзе. Каліноўскі адзін пратэставаў супраць шляхты, пратэст гэты, аднак, Дзюлёран у Варшаву не прыслаў”.

У сакавіку 1863 г. па загадзе ЦНК створаны „Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы” замест распушчанага ЛПК, кіруючыя пасады ў паўстанцкіх арганізацыях занялі ў асноўным „белыя”. Каб не ўносіць раскол у шэрагі паўстанцаў, Кастусь Каліноўскі вымушаны быў гэтаму падпарадкавацца[52].

Асобныя спробы ўзаемадзеяння паўстанцкіх атрадаў заканчваліся беспаспяхова: многія атрады былі разбіты ў самым пачатку фарміравання, таму паўстанцам не ўдалося захапіць больш-менш значныя стратэгічныя населеныя пункты. Адносны поспех спрыяў найперш за ўсё атраду Л. Звяждоўскага, прызначанага вайсковым начальнікам Магілёўскага ваяводства, які з дапамогаю студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута захапіў 24 красавіка 1863 г. павятовы горад Горкі, але неўзабаве пад Барысавам яго атрад быў разбіты царскімі войскамі, а сам Звяждоўскі трапіў у палон і яго прылюдна пакаралі смерцю ў Вільні 27 чэрвеня 1863 г.

Паказальна, што каля 70% усіх удзельнікаў паўстання, прыцягнутых расійскімі ўладамі да адказнасці, складала шляхта, у абсалютнай большасці беззямельная і малазямельная, якая здабывала сродкі для жыцця ўласнай працай на арандаванай зямлі ці ў рамястве, службай у дзяржаўных і прыватных установах. Прадстаўнікі дэмакратычных пластоў гарадскога насельніцтва і беззямельная шляхта (фактычна разначынцы) складалі каля 75% усіх паўстанцаў на тэрыторыі Беларусі. Для беларускіх сялян лозунгі Варшаўскага ЦНК аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 года былі непрыцягальнымі. Іх не магла задаволіць вельмі аб-

[51] А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 103-105.

[52] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 170.

межаваная аграрная палітыка паўстанцаў. Апрача таго, на сялян аказалі значны ўплыў шырокая антыпаўстанцкая агітацыя з боку царскіх улад і паслабленне для беларускіх губерняў умоў правядзення рэформы 1861 г.[53] Акрамя шляхты, у шэрагах паўстанцаў налічвалася 6% духавенства, 18% сялян і нязначная колькасць мяшчан.

У Гродзенскай губерні вясною 1863 г. дзейнічала пяць паўстанцкіх атрадаў, у якіх налічвалася каля 1700 чалавек і якія ў сваёй дзейнасці падпарадкоўваліся К. Каліноўскаму — мясцоваму ваяводскаму камісару[54].

22 красавіка (4 мая) 1863 г. каля мястэчка Дубічы (Віленшчына) у адной з сутычак з царскімі войскамі быў забіты камандзір паўстанцкага атрада Людвік Нарбут, сын вядомага гісторыка Беларусі і Літвы. Міхаіл Мураёў спытаў Тэадора Нарбута: „А ведаеш, нягоднік, што твой сын забіты?" Але мужны бацька адказаў прама ў вочы царскаму сатрапу: „Маю яшчэ некалькіх сыноў, усіх іх выхаваў дзеля Айчыны"[55].

У маі 1863 г. Каліноўскі разам з паўстанцкім цывільным начальнікам Гродзенскага павета Эразмам Заблоцкім аб'ехаў Слонімскі і Ваўкавыскі паветы, апошні раз пабываў у Якушоўцы, інспектаваў злучаныя сілы паўстанцаў пад Мілавідамі (напярэдадні бітвы) і Брэсцкі атрад за Бугам у Падляшшы. За май 1863 г. паўстанцы правялі каля 20 баёў з рускімі войскамі[56]. Самай значнай бітвай паміж паўстанцамі і царскімі войскамі стаў бой пад Мілавідамі Слонімскага павета 21 мая 1863 г. Удзельнічала ў ім каля 800 паўстанцаў, якім супрацьстаялі пяць рот расійскай арміі, падмацаваныя артылерыяй. Жорсткі бой працягваўся некалькі гадзін: карнікі не змаглі ўзяць лагер паўстанцаў і з вялікімі стратамі адышлі, але і паўстанцы не сталі чакаць прыбыцця новых сіл рускіх і непрыкметна пакінулі лагер[57].

Падчас паўстання адбылося шмат жорсткіх распраў над ворагам. Здараліся забойствы святароў прадстаўнікамі як аднаго, так і другога боку: так, у ноч з 22 на 23 мая загінуў праваслаўны святар мястэчка Сураж Гродзенскай губерні Канстанцін Пракаповіч, якога паўстанцы „бі-

53 Л. Падгайская, *Роля паўстанняў 1794, 1830-1831, 1863-1864 гг. у фарміраванні ўяўленняў пра беларуска-літоўскую шляхту*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 8.

54 С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 24-27.

55 В. Чаропка, *Dulce est pro patria mori. Людвік Нарбут*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 38-39.

56 В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 176-178.

57 *Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён*, т. 2: *Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.*, с. 77; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 132-134.

лі каламі і дубінамі, потым застрэлілі і павесілі", а дом разрабавалі. 22 мая 1863 г. у 10 гадзін раніцы на Лукішскай плошчы быў расстраляны вікарны ксёндз касцёла з Лідскага павета Станіслаў Ішора, віна якога заключалася толькі ў тым, што ён прачытаў адзін з маніфестаў паўстанцаў сваім парафіянам, якія сабраліся каля касцёла[58].

За барацьбой паўстанцаў з глыбокім спачуваннем сачылі рэвалюцыянеры ўсіх краін. Рэвалюцыйныя дэмакраты Расіі, прадстаўнікі рускай палітычнай эміграцыі лічылі паўстанне сваёй кроўнай справай. У абарону паўстанцаў выступілі „Колокол" А. Герцэна. М. Бакунін апублікаваў адозву „Да рускага, польскага і да ўсіх славянскіх народаў", дзе заклікаў падтрымаць патрыётаў Рэчы Паспалітай[59]. Нямала рускіх рэвалюцыянераў змагалася ў радах паўстанцаў. У заходнееўрапейскай прэсе распаўсюджвалася інфармацыя аб ходзе паўстання, збіралася і накіроўвалася паўстанцам зброя, з эмігрантаў вербаваліся добраахвотнікі. З дапамогай цэнтра „Маладая Еўропа" і асабіста Джузэпэ Гарыбальдзі рыхтаваліся палітычныя і ваенныя кіраўнікі паўстання. Пры непасрэдным удзеле Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса, якія лічылі паўстанне 1863-1864 гг. важнай састаўной часткай еўрапейскай рэвалюцыі, арганізоўваліся акцыі салідарнасці заходнееўрапейскіх рабочых з паўстанцамі.

Трэба адзначыць, што паўстанцы ў барацьбе з магутнай расійскай арміяй былі асуджаны на паразу: у Беларусі і Літве іх налічвалася прыблізна 15 000, а змагацца ім давялося супраць рэгулярнага войска, якое складалася з 218 рот салдат, 48 эскадронаў кавалерыі, 18 казацкіх сотняў, падмацаваных 120 палявымі гарматамі (усяго каля 300 000 чалавек)[60]. З прычыны несувымернасці сіл баявыя дзеянні паўстанцаў, узброеных у большасці косамі, пікамі і паляўнічымі стрэльбамі, з самага пачатку насілі характар партызанскай барацьбы: атрады пазбягалі сутычак з больш моцнымі сіламі і нападалі толькі тады, калі была надзея на поспех.

Вельмі дрэнным было ўзбраенне паўстанцаў — перш за ўсё ў руках паўстанцаў знаходзіліся старыя паляўнічыя стрэльбы, двухстволкі і штуцэры меліся ў адзінкавых экземплярах. Вялікая частка паўстанцаў 1863-1864 гг. узбройвалася самаробнымі пікамі і косамі („касінеры"). Порах і кулі паўстанцы выраблялі самастойна. Прыцэльны агонь паўстанцы маглі весці на адлегласці да 50-70 крокаў і былі амаль безабароннымі перад царскай арміяй, узброенай значна больш дасканалай зброяй[61].

[58] Б. Сачанка, *Мураўёў-Вешальнік*, [у:] *З гісторыяй на „Вы". Публіцыстычныя артыкулы*, вып. другі, Мінск 1994, с. 208.

[59] А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 100-101.

[60] Там жа, с. 137.

[61] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 180.

Атрады паўстанцаў пастаянна знаходзіліся ў руху. Прыходзячы ў вёску ці мястэчка, паўстанцы склікалі сходы жыхароў, абвяшчалі маніфест і аграрныя дэкрэты, складалі акты аб перадачы зямлі ва ўласнасць сялян, прымалі ад іх прысягу на вернасць, забіралі казённыя грошы, а сабраныя з сялян падаткі вярталі ім. Іншы раз праводзілі публічныя суды і пакаранні людзей, якія аказвалі дапамогу ўладам у барацьбе з паўстанцамі[62]. Усяго на сучаснай тэрыторыі Беларусі з лютага па жнівень 1863 г. зафіксавана 46 баёў і баявых сутычак паўстанцаў з царскім войскам, з іх 2/3 адбыліся на Гродзеншчыне і Віленшчыне.

### 4. Мураўёў-„Вешальнік" і параза паўстання

На Беларусь і Літву ў тэрміновым парадку царскім урадам былі накіраваны буйныя вайсковыя злучэнні для хутчэйшага падаўлення паўстання, а ў маі 1863 г. віленскім генерал-губернатарам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі прызначаны Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў, які за бязлітасную расправу з паўстанцамі атрымаў ад сучаснікаў мянушку „Вешальнік" — чалавек жорсткі і вельмі разумны адначасова[63]. „Наколькі высока ён [Мураўёў], — па словах князя Пятра Уладзіміравіча Даўгарукава, — стаяў па розуме і адукацыі, настолькі нізка стаяў ён па сваіх маральныях якасцях".

Існуе вельмі шырока распаўсюджанае меркаванне, што гэтую мянушку царскі сатрап атрымаў толькі пасля падаўлення паўстання 1863-1864 гг., але на самой справе яна была ў яго яшчэ за трыццаць гадоў да гэтага. Упершыню яна прыліпла да Мураўёва ў Гародні пасля пакарання там смерцю аднаго з першых беларускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў Міхаіла Валовіча (павешаны па загадзе Мураўёва ў 1833 г.).

Калі з гэтай сумнай нагоды Міхаіл Мураўёў выступаў перад гарадзенскаю шляхтаю з палкаю прамоваю, адзін са смельчакоў наўмысна гучна запытаў у свайго суседа, блізкага да губернатара чыноўніка: „А ці не сваяк наш новы губернатар майму былому знаёмаму Сяргею Мураўёву-Апосталу, які быў павешаны ў 1826 г.?"

Мураёў, які пачуў гэтае пытанне (дзеля чаго і было ўсё разлічана) закіпеў ад гневу і выкрыкнуў: „Я не з тых каго вешаюць, а з тых, хто вешае"[64].

Акрамя таго, у гэты ж час „Вешальнік" выступіў з прапановаю адмяніць дзеянне на нашых землях Статута ВКЛ 1588 г. і ўсталявання

[62] С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 29.

[63] М. В. Доўнар-Запольскі, *Гісторыя Беларусі*, с. 277; Е. В. Серак, *Система наказаний участников восстания 1863-1864 гг. в Беларуси*, с. 242.

[64] *Сыны і пасынкі Беларусі*, с. 183.

тут агульнарасійскага заканадаўства[65]. У 1831 г. Мураўёў прапанаваў зачыніць Віленскі ўніверсітэт, па яго прапанове на Беларусі скасавана ўнія і забаронены казанні на беларускай мове ў мясцовых храмах (1839-1840 гг.), а таксама забаронена ўжыванне назваў „Беларусь" і „Літва"[66].

У 1862 г. М. Мураўёва грамадскасць абвінавацiла ў бязмежным казнакрадстве (дарэчы, гэта зрабіў наш зямляк Іасафат Агрызка) і прымусілі пайсці ў адстаўку і таму былы губернатар вярнуўся да ўлады толькі дзеля таго, каб падавіць паўстанне 1863-1864 гг.

Для заспакаення сялян Беларусі і Літвы загадамі цара Аляксандра II ад 1 сакавіка і 2 лістапада 1863 г. на гэтых землях адмяняліся часоваабавязаныя адносіны, уводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў, прадугледжвалася неадкладнае вяртанне сялянскіх адрэзкаў, а таксама змяншэнне выкупных плацяжоў на 20%[67]. Акрамя таго, М. Мураёў абяцаў амністыю тым сялянам, якія пакінуць шэрагі паўстанцаў і вызначыў узнагароду ў 5 рублёў за палоннага паўстанца са зброяй і 3 рублі без зброі, таму сяляне самі пачынаюць лавіць паўстанцаў і перадаваць іх царскім карнікам. Зафіксаваны нават выпадкі, калі сяляне акружалі лес, дзе схаваліся „палякі" і падпальвалі яго з некалькіх бакоў. У гэтым была трагедыя паўстанцаў 1863 г. Як трапна адзначыў у адным са сваіх выдатных раманаў Уладзімір Караткевіч, „дзеці-дэмакраты пажалі жудасны пасеў прыгоннікаў-бацькоў"[68].

Значную ўвагу новы губернатар звярнуў на цывільнае кіраванне, маючы на мэце знайсці ў краі тыя элементы, на якія расійскія ўлады маглі б абаперціся — найперш за ўсё гэта было мясцовае сялянства. У кастрычніку 1863 г. М. Мураўёў выдаў загад аб надзяленні сялян, якія страцілі зямлю ў 1846-1856 гг., трыма дзесяцінамі зямлі; гаспадарам, якіх памешчыкі пазбавілі зямлі пасля 1857 г., надзелы вярталіся цалкам. Мураўёў абавязаў таксама сельскія таварыствы наглядаць за мясцовую шляхтаю, арганізаваў для барацьбы з паўстанцамі сялянскія каравулы, разгарнуў актыўную і прадуманую антыпаўстанцкую і антыпольскую агітацыю[69]. Новы губернатар падманваў сялян і пераконваў іх у тым, што „паны" падняліся супраць цара за вяртанне прыгону, таму сяляне пачынаюць адыходзіць ад удзелу ў паўстанні. Трэба падкрэс-

[65] С. Таляронак, *Генерал Міхаіл Мураўёў-„Вешальнік"*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1997, № 3, с. 113.

[66] Б. Сачанка, *Мураўёў-Вешальнік*, [у:] *З гісторыяй на „Вы"*, с. 206-207.

[67] *Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён*, т. 2: *Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.*, с. 81.

[68] У. С. Караткевіч, *З вякоў мінулых*, Мінск 1978, 440 с.

[69] І. Трызна, *Канстанцін Каліноўскі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 17-18.

ліць, што сацыяльная прыналежнасць для К. Каліноўскага не была галоўнай, як пісалася ў „Мужыцкай праўдзе”: „Пан будзе ліхі — пана павесім як сабаку! Мужык будзе кепскі, то і мужыка павесім, а дворы іх і сёла з дымам пойдуць і будзе справядлівая вольнасць”[70]. Нельга не адзначыць залішні радыкалізм павадыра паўстанцаў.

Адсутнасць адзінага плана баявых дзеянняў, недахоп сіл і зброі, малая падтрымка, а часта і выступленні супраць шляхты з боку сялянства, аб’яўленне беларуска-літоўскіх губерняў на ваенным становішчы і правядзенне шэрагу карных экспедыцый пад кіраўніцтвам М. Мураўёва-„Вешальніка”[71], разнагалоссі паміж кіраўнікамі паўстання, нерашучая аграрная палітыка ЦНК звузілі сацыяльную базу паўстання, скарацілі тэрыторыю, ахопленую паўстаннем[72]. Прадбачачы непазбежнасць паразы паўстання, мясцовыя памешчыкі перасталі перадаваць паўстанцам вопратку, прадукты, рыштунак, зброю і іншыя неабходныя рэчы. Расійскія ўлады арыштавалі двух членаў Аддзела, кіруючых правінцыямі Літвы: Антона Яленскага і А. Аскерку, а Я. Гейштар і Францішак Далеўскі адмовіліся ад сваіх пасад. У гэтых умовах Н. Дзюлёран летам 1863 г. вымушаны быў аддаць уладу над паўстаннем у Беларусі Кастусю Каліноўскаму, а яго бліжэйшым памочнікам стаў Уладзіслаў Малахоўскі, прызначаны начальнікам Вільні. Прыхільнікі К. Каліноўскага стварылі падпольны ўрад „Літоўска-Беларуска Чырвоны Жонд”[73].

Трэба адзначыць, што рэпрэсіям падвергліся і тыя рускія салдаты і афіцэры, якія перайшлі на бок паўстанцаў — так, 5 жніўня 1863 г. у Мінску расстраляны былы радавы лейб-гвардыі Іван Жмачынскі, які змагаўся на баку паўстанцаў[74].

Новае кіраўніцтва рабіла перамены ў мясцовых арганізацыях, выкрывала паклёп урада на паўстанне як на справу памешчыкаў, імкнулася аднавіць страчаныя сувязі з рэвалюцыйнай арганізацыяй „Зямля і воля”. Так, ад імя паўстанцаў заяўлялася: „На дзела наша — не дзела панскае, а справядлівай вольнасці, якой вашы дзяды ды бацькі здаўна жылі... Пан будзе ліхі — пана павесім як сабаку! Мужык будзе кепскі

[70] *Дастаеўскі і Каліноўскі (Спроба рэлігійна-маральнага супастаўлення лёсаў)*, с. 9.

[71] *Сыны і пасынкі Беларусі*, с. 183; В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 217.

[72] С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2003, № 7, с. 29.

[73] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 182.

[74] С. Таляронак, *Генерал Міхаіл Мураўёў-„Вешальнік”*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 1997, № 3, с. 116.

— то і мужыка павесім”. Разам з тым нельга не адзначыць, што Каліноўскі, нягледзячы на тое, што сам па паходжанні быў шляхціцам, адносіўся да шляхты адназначна негатыўна і пісаў: „Сякера паўстанца не павінна затрымвацца нават над калыскаю шляхецкага дзіцяці”. Паўстанцы заклікалі „чыншаў, аброкаў і падаткаў у казну маскоўскую ды і панам ніякіх больш не плаціць” („бо гэта зямля ўжо ваша”)[75]. Паводле загаду паўстанцкага ўрада, падаткі „народ зямлі Літоўскай і Беларускай” павінен быў плаціць толькі „казне польскай”[76].

Нягледзячы на ўсе намаганні Кастуся Каліноўскага і яго паплечнікаў, ажывіць паўстанне ўжо не ўдалося: мясцовае дваранства канчаткова адышло ад руху і прыняло ўдзел у кампаніі „вернападданіцкіх адрасоў” імператару Аляксандру II[77]. 28 жніўня 1863 г. Польскі Нацыянальны Урад аддаў загад аб спыненні ваенных дзеянняў. Узброеная барацьба ў Беларусі спынілася восенню 1863 г., а летам 1864 г. царскімі жандарамі ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце.

Нерухомая і рухомая маёмасць пакараных судом удзельнікаў паўстання канфіскоўвалася, а высланых адміністрацыйна — секвестравалася, на ўсіх западозраных у спачуванні паўстанню адвольна накладаліся ўсемагчымыя і нічым не рэгламентаваныя штрафы. Жыхарам мужчынскага полу (акрамя сялян) забаранялася без дазволу ўлад адлучацца з дому далей, чым на 30 вёрст. Тыя ж вёскі, дзе паўстанцы знаходзілі падтрымку, цалкам спальваліся, маёмасць жыхароў прадавалася з аукцыёну, а самі яны высылаліся ў аддаленыя губерні Расіі[78]. Маёнткі памешчыкаў, якія не даносілі аб з’яўленні ў іх уладаннях паўстанцаў, адбіраліся ў казну[79]. Былі закрыты дваранскія сходы, а выбраныя імі кіраўнікі („прадвадзіцелі”, на мясцовы лад маршалкі) дваранства замяняліся лаяльнымі да расійскага панавання на гэтых землях асобамі.

М. Мураўёў таксама зрабіў захады для замены польскіх чыноўнікаў рускімі (праваслаўнымі), настаўнікамі і медыцынскімі работнікамі (ім у параўнанні з цэнтральнымі губернямі Расіі павышаўся на 50% аклад, акрамя таго давалася магчымасць набыць на ільготных умовах зямлю і зрабіць хуткую кар’еру)[80], а таксама зачыняў каталіцкія кляштары і касцёлы ці пераўтварыў іх у праваслаўныя, спрабаваў узмацніць значэнне праваслаўнага духавенства і падняць яго матэрыяльны дабрабыт,

[75] В. Ф. Шалькевіч, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі*, с. 217.

[76] А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 154.

[77] К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 111.

[78] *История Беларуси в документах и материалах*, с. 200.

[79] В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 174.

[80] Б. Сачанка, *Мураўёў-Вешальнік*, [у:] *З гісторыяй на „Вы”*, с. 214-215.

акрамя таго ў навучальных і грамадскіх установах уводзілася руская мова як абавязковая, забаронена выкладанне польскай мовы, зачыняліся польскія бібліятэкі.

Ва ўмовах страшэннага тэрору, здрадніцтва і шпіёнства Кастусю Каліноўскаму, дзякуючы незвычайным здольнасцям канспіратара, удалося заставацца на волі да канца студзеня 1864 г., пры гэтым ён не раз мог перайсці мяжу Расійскай Імперыі і захаваць сабе жыццё. Але Каліноўскі хацеў захаваць падпольную паўстанцкую арганізацыю з мэтай падрыхтоўкі новага паўстання на Літве і Беларусі. У студзені 1864 г. схоплены паліцыяй сувязны паўстанцаў студэнт Вітаўт Парфіяновіч (у некаторых крыніцах, Парафіяновіч, шляхціц з Мінскай губерні) выдаў віленскі адрас К. Каліноўскага і імя і статус, пад якімі павадыр паўстання ў гэты час пражываў — настаўнік геаграфіі Ігнат Вітажэнец[81]. Здраднік таксама падрабязна апісаў змененую знешнасць павадыра паўстання і нават інтэр’ер яго пакоя. За гэта ўлады захавалі Парфіяновічу жыццё, і потым ён атрымаў пасаду дробнага чыноўніка ў Томску.

Апошнім адрасам Каліноўскага сталі так званыя Святаянскія муры (комплекс будынкаў былога Віленскага ўніверсітэта), насупраць генерал-губернатарскага палаца, дзе жыў душыцель паўстання М. М. Мураўёў-„Вешальнік”. Паліцыя зрабіла татальны вобыск, ачапіла ўвесь квартал, дзеля чаго спатрэбіліся дзве роты салдат, падзеленых на 10 партый пры афіцэрах паліцыі і асобных чыноўніках[82]. Карнікі дабіліся свайго — арыштавалі Каліноўскага, але з турмы павадыру паўстанцаў удалося перадаць на волю верш „Марыська чарнаброва” і „Ліст з-пад шыбеніцы”[83], у якім рэзка крытыкавалася аграрная палітыка царызму на Беларусі, паказвалася антысялянская сутнасць рэформы 1861 г., а таксама гвалтоўная русіфікацыя палякаў, беларусаў і літоўцаў, даказвалася неабходнасць атрымання адукацыі на роднай мове[84].

[81] *Асветнікі зямлі беларускай (X — пач. XX стст.)*, с. 452; С. Ф. Сокал, *Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі*, с. 113-114; *Сыны і пасынкі Беларусі*, с. 174; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 194; В. Шалькевіч, *„Марыська чарнаброва, галубка мая...”*, „Работніца і сялянка”, 1993, № 2, с. 15-16.

[82] Б. Сачанка, *Мураўёў-Вешальнік*, [у:] *З гісторыяй на „Вы”*, с. 211.

[83] Г. Кісялёў, *Каліноўскі — знаёмы і незнаёмы*, „Полымя”, 1993, № 6, с. 220.

[84] М. Б. Батвіннік, *Г. В. Кісялёў — даследчык жыцця, дзейнасці і светапогляду К. Каліноўскага*, „Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук”, 1995, № 3, с. 83; А. Смаленчук, *Кастусь Каліноўскі ў гістарычным нарысе Івана Цвікевіча*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2003, № 7, с. 12; А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 160-161; І. Трызна, *Канстанцін Каліноўскі*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2003, № 7, с. 20.

Падчас следства К. Каліноўскі паказаў сябе як мужны рэвалюцыянер. Ён трымаўся з мужнасцю і годнасцю, не выдаў нікога са сваіх таварышаў. Вайскова-палявы суд прысудзіў Каліноўскага да расстрэлу, але М. Мураўёў замяніў яго вісельняй. 10 (22) сакавіка 1864 г. у 10 гадзін 30 хвілін раніцы на Гандлёвай (Лукішскай) плошчы ў Вільні, у прысутнасці вялікага натоўпу, Кастусь Каліноўскі быў павешаны. Калі зачытваўся прыгавор, каты назвалі Каліноўскага дваранінам[85], але ён гучна крыкнуў у натоўп: „У нас няма дваран, усе роўныя". Паліцэйскі папрасіў яго замаўчаць...

Але К. Каліноўскі не змоўк. Як стала зусім нядаўна вядома дзякуючы вучоным, якія даследавалі архіў часопіса „Русская старина", дзе ў 1883 (№ 10-12) і 1884 (№ 1) гадах упершыню друкаваліся артыкулы біёграфа М. М. Мураўёва Аляксандра Масалава: „З самых апошніх выкрыкаў Каліноўскага відаць было, што ён не толькі быў (...) паўстанцам, але дзіцём сусветнай сацыяльнай рэвалюцыі"[86].

У Беларусі і Літве 128 (афіцыйныя дадзеныя) паўстанцаў царскія ўлады пакаралі смерцю, 853 саслалі на катаргу, каля 12 500 чалавек выселілі, у тым ліку 504 — на пасяленне ў Сібір, акрамя таго многія актыўныя ўдзельнікі паўстання былі аштрафаваны царскімі ўладамі на вялікую суму, падвергліся турэмнаму зняволенню, заставаліся пад пільным і несупынным наглядам паліцыі і г.д.[87] З падаўленнем паўстання 1863-1864 гг. пачынаецца масавая эміграцыя з Беларусі „ва ўсе бакі свету": „Усё, што ёсць больш энергічнага і здольнага з беднаты, пакідае Беларусь"[88].

Паўстанне 1863-1864 гг. было накіравана супраць самадзяржаўя, перажыткаў часоў прыгонніцтва, супраць нацыянальнага прыгнёту і сaслоўнай няроўнасці — яно прымусіла царскі ўрад пайсці на больш выгадныя ўмовы правядзення сялянскай рэформы на Беларусі і Літве. Памешчыкам-палякам забаранялася набываць зямлю на Беларусі, а сяля-

[85] І на самой справе, калі рускія дваране „были страшно далеки от народа" (У. І. Ленін), то беларуска-літоўская шляхта была побач з ім і складала неад'емную яго частку. І. У. Вішнеўская, *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі...*, с. 166; У. М. Ігнатоўскі, *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*, с. 170 (у Ігнатоўскага памылковая дата павешання Каліноўскага 7 (20) красавіка 1864 г.); *История Беларуси в документах и материалах*, с. 209; К. Каліноўскі, *За нашую вольнасць*, с. 111.

[86] Б. Сачанка, *Мураўёў-Вешальнік*, [у:] *З гісторыяй на „Вы"*, с. 213.

[87] Е. В. Серак, *Система наказаний участников восстания 1863-1864 гг. в Беларуси...*, с. 239; *Сыны і пасынкі Беларусі*, с. 183; В. Ф. Шалькевич, *Кастусь Калиновский: страницы биографии*, с. 174.

[88] У. М. Ігнатоўскі, *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*, с. 171.

не-каталікі не маглі валодаць болей 60 дзесяцін зямлі[89]. Паўстанне 1863-1864 гг. аказала вялікі ўплыў на ажыўленне рэвалюцыйнага руху ў Расіі і Заходней Еўропе, садзейнічала абуджэнню беларускага нацыянальнага руху, разам з тым паўстанне мела і адмоўныя вынікі: яно змяніла і надоўга затрымала правядзенне ў Беларусі прагрэсіўных рэформ 60-70-х гадоў XIX ст., напрыклад, земская рэформа не праводзілася доўгі час наогул, судовая, цэнзурная і гарадская праведзены са значным спазненнем і істотнымі адступленнямі ад агульнарасійскіх прынцыпаў. Да канца 60-х гадоў XIX стагоддзя ў краі захоўвалася ваеннае становішча[90].

Пасля паразы паўстання 1863-1864 гг. у заходніх губернях Расійскай Імперыі пачалася працяглая паласа палітычнай рэакцыі і татальнай русіфікацыі, усталяваўся рэжым выключных законаў ваеннага часу. Жорсткімі рэпрэсіямі былі знішчаны тыя парасткі беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння, якія ўзніклі на працягу 40-50-х гг. XIX ст., і надоўга выкаранены ўсе праявы рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай дзейнасці. З падаўленнем паўстання звязана і закрыццё адзінай на той час на Беларусі вышэйшай навучальнай установы — Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Да канца свайго існавання расійскае самаўладдзе так і не дазволіла адкрыць тут хоць адну вышэйшую навучальную ўстанову, што адмоўна адбілася на фарміраванні інтэлігенцыі, развіцці навукі і культуры Беларусі.

## Заключэнне

Паўстанне 1863-1864 гг. — яскравая і гераічная старонка беларускай гісторыі. Многія з паўстанцаў былі яшчэ зусім маладымі людзьмі, якія не шкадавалі свайго жыцця дзеля свабоды і шчасця сваёй краіны — яны свядома ішлі на смерць, ведаючы, што ў бітве з незлічонымі і добра ўзброенымі войскамі Расійскай Імперыі ў іх фактычна няма ніякіх шансаў, але гонар краіны для іх быў даражэй за жыццё, таму іх жыццё і подзвігі застаюцца для нас прыкладам высокай мужнасці і гераізму, любові да сваёй Радзімы і гатоўнасці ахвяраваць дзеля яе шчасця самым дарагім — уласным жыццём.

Кастусь Каліноўскі на працягу свайго жыцця заставаўся прыкладам для маладых сучаснікаў: адукаваны, смелы, адважны, рашучы. К. Каліноўскім быў паслядоўным арганізатарам і таленавітым канспіратарам, самым яркім і выбітным павадыром паўстання. Нельга таксама не адзначыць і шматграннасць таленту К. Каліноўскага, які праявіў сябе як палымяны журналіст і літаратар, адзін з заснавальнікаў рэалізму ў бе-

[89] С. Барыс, *Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2003, № 7, с. 29.

[90] А. Ф. Смирнов, *Кастусь Калиновский*, с. 167.

ларускай літаратуры. Безумоўна, як і ў дачыненні да кожнага вялікага чалавека, асоба Каліноўскага і яго роля настолькі шматгранная і супрацьлеглая, што яе нельга маляваць адным колерам — белым ці чорным. У Кастуся Каліноўскага было і тое, і другое, але „белага" было, безумоўна, значна больш, таму Каліноўскі займае ў гісторыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі XIX ст. асаблівае месца, якое яшчэ да канца не асэнсавана і прааналізавана.

У 1995 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь зацвердзіў палажэнне аб ордэне К. Каліноўскага. Новая дзяржаўная ўзнагарода нашай краіны — знак прызнання значнасці асобы Каліноўскага ў гісторыі Беларусі. Сучасныя даследчыкі сцвярджаюць, што думкі К. Каліноўскага аб неабходнасці змагання за сваю Бацькаўшчыну, выказаныя ім у сваім „Лісце з-пад шыбеніцы", можна лічыць пачатковым афармленнем нацыянальнай ідэі, разам з тым яна яшчэ не была да канца сфармулявана.

**Streszczenie**

Artykuł traktuje o życiu i działalności Kastusia (Wincentego Konstantego) Kalinowskiego (1838-1864), przywódcy powstania narodowo-wyzwoleńczego na Białorusi i Litwie w latach 1863-1864. Autor ukazuje wielostronność postaci Kalinowskiego, jego poglądy polityczne i prawne, liczne talenty — Kalinowski był utalentowanym dziennikarzem, literatem, konspiratorem i wojskowym dowódcą. Opowiada o przebiegu działań bojowych w czasie powstania, o udziale w nim różnych grup miejscowej ludności, o politycznych nurtach w szeregach powstańców, o wspólnej walce o wolność przedstawicieli białoruskiego, polskiego, litewskiego, ukraińskiego i najlepszych przedstawicieli rosyjskiego narodu oraz o podejmowanych przez rząd carski i administrację Michała Murawiowa-„Wieszatiela" działaniach mających na celu zdławienie powstania, o pozytywnych i negatywnych rezultatach powstania styczniowego. Według autora pamięć o Konstantym Kalinowskim — szczerym i oddanym obrońcy ludu — na zawsze pozostanie w sercach wdzięcznych potomnych.